УДК 808. 26 -- 323

**Г.К. Семянькова**

# Неафіцыйнае іменаванне жыхароў Віцебшчыны і светапогляд беларусаў

Мянушка з'яўляецца адной з найбольш старажытных антрапанімных адзінак. Яна вельмі шырока выкарыстоўвалася ў якасці ідэнтыфікатара асобы ў дахрысціянскі перыяд. Цікава, што і ў наш час 40% сучасных прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны ўтворана ад імёнаў-мянушак апелятыўнага характару. Вызначальна, што больш, чым 1/3 частка такіх апелятываў – адзінкі, якія характарызуюць чалавека ў фізічным або псіхічным плане.

Што ж уяўляюць сабой сучасныя мянушкі, ці адрозніваюцца яны ад тых, што выкарыстоўваліся нашымі продкамі? Адказаць на пастаўленыя пытанні – мэта прапануемага артыкула. Матэрыялам паслужылі сучасныя мянушкі, сабраныя аўтарам артыкула, а таксама ўдзельнікамі абласнога завочнага конкурсу «Сучасная антрапанімія Віцебшчыны», які праводзіўся з 16 кастрычніка 2000 г. па 16 красавіка 2001 г. Віцебскім абласным аб'яднаннем па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі сумесна з Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П.М. Машэрава.

Мянушкі, як вядома, называюць чалавека паводле пэўных вызначальных, характарыстычных асаблівасцей. У залежнасці ад таго, якая рыса асобы падкрэсліваецца, вылучаюцца мянушкі:

1. Па рысах характару: а) жвавы: *Чыжык*; б) гаваркі: *Сарока, Птушка-Гаварун*; в) паліглот, усё ведае: *Знайка, Знахар*; г) надакучлівы, да ўсіх чапляецца: *Жвачка*; д) з прычудамі: *Дзівак*; е) акуратны, далікатны: *Міледзя* (носьбітам гэтай мянушкі з'яўляецца мужчына); ж) хітры: *Ліса*; з) прыхільнік выпіўкі: *Мачыла* (параўн. *замачыць* 'адзначыць выпіўкай якую-небудзь падзею, справу і пад.' [1]), *Драбідан* (параўн. *напіцца ўдрабідан* 'быць вельмі п'яным'); і) той, хто ўвесь час камандуе, аддае загады: *Маёр* або *Маёрчык, Македонскі*; к) слабавольны: *Шланг* (аднавяскоўцы сцвярджаюць, што гэтым чалавекам можна вярцець, як *шлангам*); л) замаруджаны, каб нешта зразумеў, трэба доўга тлумачыць: *Пласцілін*; м) цікаўны, лезе ва ўсе справы: *Крыса, Бадун* (пра носьбіта апошняй мянушкі гавораць «да кожнага *прыбадзецца*»); н) сэрцаед: *Халдзей* (відаць, *халдзей* па-мясцоваму 'хахаль', хоць у слоўніках лексема *халдзеі* фіксуецца са значэннем 'семіцкае племя, якое ў 2-м тысячагоддзі да н. э. жыло на ўзбярэжжы Персідскага заліва і ўтварыла Навававілонскую дзяржаву' [1]); о) неахайная: *Саплёўка*; неахайная, сварлівая, нячыстая на руку: *Дзюндзя*.

2. Па росту і целаскладу: а) высокага росту: *Цыба* (параўн. *цыбаты* 'высокі, хударлявы', 'з доўгімі нагамі', *Вярзіла, Карандаш, Маркоўка, Каланча Тры Метры, Фунцік* (у аснове апошняй мянушкі назіраем з'яву антыфразіса – ужыванне слова ў супрацьлеглым значэнні); б) нізкага росту: *Макрыца, Паранёк, Метр У Кепцы Два У Скачку*; в) тоўсты: *Сала, Пузыр, Булка, Коржык, Жабацінскі*; г) худы: *Спічка, Рахіт*; д) мажная, напорыстая: *Стопяцідзесятка*; е) шыракаплечы: *Кувалда.*

3. Па рысах твару: а) з вострымі рысамі твару: *Каршун*; б) шыракатвары: *Морда*; в) з доўгім носам: *Каркуша*; з доўгім і тоўстым носам: *Дзюба*; г) з вялікімі пярэднімі або верхнімі зубамі: *Заяц, Кролік*; д) з вяснушкамі: *Рабая.*

4. Па асаблівасцях галавы і яе частак, наяўнасці валасоў і іх колеры: а) з вялікай галавой: *Башка, Галавасцік*; б) з лысінай: *Лысы*; в) з вялікімі адтапыранымі вушамі: *Лапух*; г) з маленькімі вушкамі: *Карнавушка*; д) па колеры валасоў: *Белы, Белка, Рыжая*; е) па колеры валасоў і скуры: *Цыганка, Саід, Рома, Басурман, Джахар* (усе носьбіты прыведзеных мянушак маюць чорныя валасы і смуглую скуру).

5. Па іншых фізічных асаблівасцях: а) крываногі: *Кавалерыя*; б) мілавідная: *Кукла, Лялька.*

6. Па фізічных недахопах і паталагічных адхіленнях: а) кульгавы: *Шлёп-Нага*; б) жанчына, якая прыжмурвае адно вока, бо яно хворае: *Камбала*; в) невыразна размаўляе: *Гугнавая*; г) заікаецца: *Траіла*; д) з дрэнным зрокам, у акулярах: *Лінза, Сава.*

7. Па прафесіі, роду заняткаў: *Соль-Вада* – такую мянушку далі працаўнікі фермы чалавеку, які, прыязджаючы да іх, кожны раз пытаўся: «Соль, вада ёсць?», бо вазіў гэта каровам і цялятам; *Гарманіст; Канюхоўскія Музыкі* – так называюць двух жыхароў вёскі Канюхова Глыбоцкага р-на, якія добра іграюць на гармоніках, таму іх часта запрашаюць на вячоркі, вяселлі і іншыя святы; *Ляпіла* – чалавек, які ўмее класці («ляпіць») печы; *Камінар* – рабіў коміны ў печы; *Тачыла* – токар; *Сталярок; Баценька* – быў дырэктарам саўгаса; *Боцман* – служыў на марфлоце; *Булён* – быў поварам у арміі; *Парцейка* – зараз пенсіянерка, а ў маладосці ўступіла ў партыю, была актывісткай; *Дзепутат* – некалі выбіраўся ў дэпутаты мясцовага савета; *Капітан* – у арміі меў званне капітана; *Калавурка* – жанчына, якая жыла каля царквы і *«калавурыла»* (ад рус. *караулила* 'вартавала') яе; *Новы Рускі* – займаецца прадпрымальніцтвам; *Інструктар* – працуе ў майстэрні; *Афіцэр Савецкай Арміі* – служыў за мяжой, мае званне старшага лейтэнанта, а калі падап'е, любіць гаварыць: «Я – афіцэр Савецкай Арміі!».

8. Па асаблівасцях з'яўлення і пражывання ў населеным пункце: *Бомж* – калі гэты чалавек з'явіўся ў вёсцы, то папаўзлі чуткі, што ён прыехаў з горада, бо яму там няма дзе жыць; *Куплёнка* – купіла ў вёсцы хату і пераехала ў яе; *Навасёліха* – прыезджая; *Канцавы* – жыве на канцы вёскі; *Марчулёніс* – прыезджы з Літвы; *Маскоўка, Руская* – прыезджыя з Расіі; *Капіталіст* – прыехаў з Англіі; *Малдова* – з Малдовы; *Скабарэк* – прыезджы з Пскоўшчыны.

9. Па незвычайных абставінах жыцця, а таксама ўчынках і паводзінах, не характэрных для іншых жыхароў вёскі: *Лятун* – чалавек, які вельмі хутка ездзіць на аўтобусе (аднавяскоўцы гавораць *«лётае»*); *Камендант* – жанчына, якую ў вёсцы ўсе паважаюць, заўсёды прыслухоўваюцца да яе парад; *Пінгвін* – паходка гэтага мужчыны, калі ён падап'е, нагадвае паходку пінгвіна; *Сава* – цікаўная жанчына, якая назірае за ўсімі праз вокны; *Халтура* – прыхільнік «левых» заробкаў; *Шалашоўка* – жанчына лёгкіх паводзін; *Супер-Баба* – выхоўвае васьмярых дзяцей, прычым усе яны – ад розных бацькоў; *Курыца* – жанчына, якая вельмі марудна працуе, нібы курыца на сметніку капаецца; *Паранджа* або *Моўша* – мужчына, які часта ездзіць на кані, пры гэтым закутваецца ў самыя неверагодныя анучы; *Шапачка* – жанчына-модніца пажылога ўзросту; *Коцік* – калі спіць, то мурлыча, нібы кот; *Божы Адуванчык* – старая жанчына, якая фарбуе валасы ў рыжы колер; *Смерць* – дзяўчына вельмі баіцца смерці і ўсім пра гэта гаворыць; *Шлёпаўка* – старая жанчына, якой пры хадзе цяжка перастаўляць ногі, таму яна заўсёды *шлёпае* абуткам; *Дзядзя* – чалавек, у якога пляменнік аднаго ўзросту з ім; *Вургаўка* – хутка гаворыць, часам нават сама з сабой; *Дзядуля* – ажаніўся з жанчынай, у якой ужо былі ўнукі.

10. Па словах ў выразах, якія часта ўжываюць: *Мамачка; Панімаеш; Ужас; Ё-Маё; Зара* – носьбіт гэтай мянушкі замест слова *зараз* вымаўляе *зара*; *Лац-*

*вяк* – часта ўжывае слова *лацвей* 'лепш, зручней' [2]; *Зема* – мужчына, які ўсіх землякоў называе *земамі; Брэйт* – чалавек, у сям'і якога ўжываецца выраз «тым часам *брэйт* з квасам».

11. Па схільнасці да прадуктаў харчавання: *Блін; Дранік* (пры ўтварэнні гэтай мянушкі слова *дранік* набыло пераноснае значэнне, якое і рэалізуецца ў антрапоніме, – 'смачнае, лепшае', таму што мянушка ўзнікла наступным чынам: у сям'і пасля жаніцьбы двух старэйшых братоў застаўся толькі малодшы – любімчык маці, прыхільнік смачнай стравы).

Часта мянушка, якую далі чалавеку яшчэ ў дзіцячыя гады, суправаджае яго на працягу ўсяго жыцця. Звычайна штуршком для іх узнікнення служыць нейкая адметная падзея, факт, абставіны. Напрыклад, мянушку *Карпуша* далі хлопцу, які ў дзяцінстве злавіў плотку, але ўсім даказваў, што гэта *карп*. Зараз гэтаму чалавеку 25 гадоў, але ён усё роўна *Карпуша*. Мянушцы *Дзёдзя* каля 30 гадоў. А ўзнікла яна наступным чынам: яе носьбіт у дзіцячыя гады вельмі дрэнна вымаўляў сваё імя: замест Сярожа ў яго атрымлівалася *Дзёдзя*. Носьбіт мянушкі *Трын* у дзяцінстве вельмі любіў утвараць гукі «тр-р-р». Мянушку *Ксёнз* далі школьнікі свайму аднакласніку за тое, што таму падабалася насіць нацельны крыжык. Мянушку *Шпачок* атрымаў маленькі шчупленькі хлопец, які часта пачынаў бойкі з аднагодкамі.

Як вядома, кінематограф, эстрада, літаратура заўсёды аказваюць уплыў на склад антрапанімікону. Зараз гэты ўплыў яшчэ больш узмацніўся. На Віцебшчыне выяўлена каля дзвюх дзесяткаў мянушак, утвораных ад імёнаў герояў кіна- і мультфільмаў, тэлесерыялаў і рэкламных ролікаў. Носьбітам такіх мянушак уласцівы тыя ж унутраныя або знешнія рысы, што і адпаведным героям. Прыводзім найбольш яркія прыклады, звязаныя:

а) з кінафільмамі: мянушку *Кір'ян* атрымаў малады чалавек, які сябраваў з дзяўчынай па імені Анфіса (успомніце Кір'яна і Анфісу – герояў кінафільма «Вечны кліч»). *Грышам* празвалі аднавяскоўцы мужчыну, які, як падап'е, мае страшны, ваяўнічы выгляд (успомніце эпізод у падземным пераходзе з фільма «Сем старыкоў і адна дзяўчына», калі герой стаў ахвярай страшнага, высокага, мажнага Грышы, які ў момант удару кагосьці кулаком па галаве прыгаворваў: «Я – Грыша!»). Дзяўчыну, на футболцы якой выбіта лічба 13, аднагодкі сталі называць *Пятніца Трынаццатага* (нагадаем, што фільмы жахаў пад назвай «Пятніца 13-га» часта транслююцца па тэлебачанні). Мянушку *Афоня* атрымаў чалавек, падобны на героя аднайменнага кінафільма. Мянушка ж *Шурык*, як нам падаецца, уласціва многім хударлявым Аляксандрам у акулярах;

б) з тэлесерыяламі: мянушка *Мама Чоля* ўзнікла пасля паказу мексіканскіх тэлесерыялаў, а атрымала яе неахайная жанчына, якая любіць мацярыцца. Дзяўчыну з прозвішчам Герасімава аднакласнікі называюць *Герэра Дэ Салінас;*

в) з мультфільмамі: мянушка *Вжык* або *Бжык* узнікла ў дзіцячым асяроддзі, у школе яе атрымаў хлопец, падобны на героя мультфільма У.Дыснея «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу», маленькі, худзенькі, вяртлявы. *Дзюймовачкай* называюць дзяўчынку нізкага росту, а *Віні-Пухам* – мужчыну з акруглымі формамі цела;

г) з рэкламнымі ролікамі: *Досяй* празвалі школьнікі паўнаватую дзяўчыну, а мянушку *Галіна-Бланка* атрымала дзяўчына па імені Галіна.

Выяўлена некалькі мянушак, у аснове якіх – знешняе або ўнутранае падабенства носьбіта з вядомай, папулярнай асобай. Напрыклад, у вёсцы Трыполле Расонскага раёна жыве чалавек, які носіць мянушку *Талвінскі*. Гісторыя яе ўзнікнення наступная. Калісьці ў гэтых краях жыў пан Талвінскі – багаты пан з вялікай гаспадаркай. Ён надоўга застаўся ў памяці старажылаў. Сён-

няшні *Талвінскі* таксама мае вялікую гаспадарку, што і стала вызначальным для таго, каб аднавяскоўцы далі яму такую мянушку.

Цікава, што ў гэтай жа вёсцы бытуе яшчэ адна мянушка, якая ўзнікла на аснове падабенства яе носьбіта з рэальна жыўшай асобай. У 30-я гг. XX ст. актывістка, якую звалі *Сабаліха* (відаць, таксама мянушка), агітавала жыхароў уступаць у калгасы. Сённяшняя *Сабаліха* – жанчына, якая, як сцвярджаюць людзі, вельмі падобная на тую, што 70 гадоў назад прапагандавала калгасны лад жыцця.

А вось носьбіт мянушкі *Рэнальда* – хлопец, які займаецца ў футбольнай секцыі і вельмі падобны на цёзку-футбаліста.

Часта штуршком для ўзнікнення мянушкі служыць не падабенства знешняга выгляду ці характару, а выпадковае супадзенне імёнаў або імёнаў і імёнаў па бацьку: жанчына па імені Ядвіга носіць мянушку *Паплаўская*, па імені Валянціна – мянушку *Церашкова*, хлопец па імені Канстанцін атрымаў у школе мянушку *Кастусь Каліноўскі*, а мужчына, якога завуць Аляксандр Сяргеевіч, -- *Пушкін*. У студэнцкім асяроддзі ўзнікла мянушка *Гогаль-Могаль:* яе далі выкладчыку, імя і імя па бацьку якога супадаюць з імем і імем па бацьку пісьменніка – Мікалая Васільевіча Гогаля.

Але самымі частотнымі на Віцебшчыне з'яўляюцца мянушкі, утвораныя ад імёнаў і прозвішчаў.

Так, па ўсёй тэрыторыі распаўсюджаны мянушкі, што паходзяць ад прозвішчаў: *Крывы* -- ад прозвішча Крывёнак, *Лопік* – ад Лапека, *Шашок* – ад Шашкоў, *Моня* – ад Манькоў, *Чарапок* – ад Чарапіцкі, *Ярмак* – ад Ермачонак і шмат іншых. На захадзе Віцебскай вобласці вельмі часта мянушкі жанчын утвараюцца ад іх прозвішчаў: *Лукшыха* – ад прозвішча Лукша, *Пратасіха* – ад Протас, *Макрэнчыха* – ад Макрэнка, *Новічыха* – ад Новік, *Курашыха* – ад Кураш.

Шмат *жаночых* мянушак, што паходзяць ад імёнаў і мянушак мужоў. Ад імёнаў утварыліся наступныя адзінкі: *Пеціха* 'жонка Пеці', *Сеньчыха* 'жонка Сенькі', а таксама *Лявоніха, Барысіха, Ніканорыха, Ільюшчыха, Валянціпіха, Ніканіха, Дзёмчыха* і інш. Ад мянушак мужоў паходзяць антрапонімы *Каніха* 'жонка мужчыны па мянушцы Конь Дзеравянны', *Мамлочыха* 'жонка Мамлока' і інш.

Шэраг *мужчынскіх* мянушак узнікла ад імёнаў бацькі шляхам далучэння фармантаў *-ёнак*: *Апанасёнак* 'сын Апанаса', *Сергяёнак* 'сын Сяргея', *Сяньчонак* 'сын Сенькі'; *-ік*: *Міцік* 'сын Міці'; *-ян*: *Талян* 'сын Толі'. Мянушкі *жанчын*, што паходзяць ад імёнаў бацькі, заканчваюцца, як правіла, на *-ішка*: *Сцепанішка* 'дачка Сцяпана'; *-оўна*: *Цімхоўна* 'дачка Цімкі', *Якушоўна* або на *-ова*: *Паўлючкова* 'дачка Паўлючка'. У выпадку, калі дзіця выхоўвалася без роднага бацькі, яно атрымлівае мянушку па імені маці: *Марылішка* 'дачка Марылі', *Матрошка* 'дачка Матроны'.

Надзвычай рэдка назіраем утварэнне мянушак ад імёнаў іншых сваякоў – дзеда, цешчы, брата. Напрыклад, мянушку *Габрыэль* атрымаў малады чалавек, дзеда якога звалі Гаўрыла. Нетрадыцыйнай, можна нават сказаць унікальнай з'яўляецца мянушка *Маісей,* якую далі зяцю па імені цешчы Маісы. У в.Лазічы Глыбоцкага р-на зафіксаваны адзінкавы выпадак, калі мянушка жанчыны ўзнікла ад імя брата: Марыю Пятроўскую (па пашпарту) мясцовыя жыхары завуць па брату Вацлаву – *Вацюкова.* Сярод прычын з'яўлення такой мянушкі яны называюць тое, што жанчына позна выйшла замуж. Відаць, у асяроддзі трэба было нейкім чынам адрозніць яе ад цёзак, а паколькі яна незамужняя, то наймення па мужу, якое даюць у такіх выпадках, атрымаць не магла. Таму і празвалі яе па брату. Можна таксама выказаць здагадку, што

гэты брат чымсьці адметны ў вясковым асяроддзі, раз менавіта яго імя, а не імя, напрыклад, бацькі, паслужыла базай для ўтварэння мянушкі сястры.

Мода на замежнае, незвычайнае знайшла адлюстраванне ў мянушках, якія ўтвораны шляхам перадачы імёнаў і прозвішчаў іх іншамоўнымі адпаведнікамі: ад імені дзеда Гаўрылы паходзіць мянушка ўнука – *Габрыэль*; дзяўчыну Кацярыну ў школе называюць *Катрын*; хлопец з прозвішчам Жэнаў носіць мянушку *Джон.*

Вылучаецца група мянушак, прычынай узнікнення якіх з'яўляецца нетрадыцыйны характар прозвішча, немагчымасць суаднясення яго з рэальнай з'явай або прадметам. У такім выпадку у асяроддзі, у якім жыве носьбіт такога прозвішча, узнікаюць розныя, парой нават самыя неверагодныя, асацыяцыі, што і нараджае мянушкі. Прыводзім некалькі прыкладаў: мянушку *Зэдлік* атрымаў чалавек з прозвішчам *Рэдліг*, мянушку *Дранік* – носьбіт прозвішча *Драйліх*, мянушку *Чырвонец* – дзяўчына з прозвішчам *Дзесятнікава.*

Білінгвізм, імкненне перакласці імя або прозвішча з рускай мовы на беларускую або наадварот нарадзілі наступныя мянушкі: *Гузік* (яе носьбіт мае прозвішча *Пугаўка*), *Галінка А Па-руску Ветачка* (так называлі дзяўчыну па імені *Галіна*).

Як правіла, носьбітам асобна ўзятай мянушкі з'яўляецца нейкі адзін канкрэтны чалавек. Але на Віцебшчыне бытуюць мянушкі, якія можна ахарактарызаваць як сямейныя, бо яны ўласцівы ўсёй сям'і. Прыводзім некалькі такіх адзінак разам з кароткімі каментарыямі да іх. На Верхнядзвіншчыне жывуць сем'і з мянушкамі *Свісткі* (члены гэтай сям'і невысокага росту, пранырлівыя, цікаўныя), *Клапы* (бо пухленькія, чырванашчокія, злыя, куслівыя). На Глыбоччыне бытуюць наступныя сямейныя мянушкі: *Знахары* (усё пра ўсіх ведаюць), *Седуны* (першы носьбіт мянушкі ў дзяцінстве доўга не хадзіў, а сядзеў), *Вурачкі* (незадаволеныя ўсім людзі, ад дзеяслова *вурчаць*), *Рулюкі* (першы носьбіт мянушкі пастаянна вытрымліваў пост, падчас якога еў *рулі* – посную ежу).

Звычайна агульная сямейная мянушка адрозніваецца ў старэйшых і малодшых, у мужчын і жанчын па форме. Напрыклад, у Азярэцкім сельсавеце Глыбоцкага р-на галаву сям'і завуць *Чорт*, яго сына – *Чарток*, а жонку *Чарціха*; у в.Роўнае Шумілінскага р-на бацьку клічуць *Бык*, а сына – *Бычок*, бацьку – *Поп*, а сына – *Папок*; у в.Лазічы Глыбоцкага р-на бацька носіць мянушку *Гармонік*, а яго дзеці – *Гармонічкі*; у в.Панамары Шумілінскага р-на гаспадыню называюць *Удава*, а яе дачку – *Удовішка.*

Нешматлікімі па колькасці з'яўляюцца мянушкі, якія ўяўляюць сабой агульныя назвы прадстаўнікоў асобных населеных пунктаў. У Глыбоцкім р-не, напрыклад, жыхароў в.Удзела ў акаляючых вёсках называюць *смалякамі*, бо раней тут была смалакурня. А жыхароў в.Крывічы ў в.Пліса гэтага ж р-на – *крывіцкія палонікі* або *лапонікі*, што абазначае 'людзі простыя, бедныя, няўмелыя'.

Калі населены пункт дзеліцца на часткі, якія маюць сваю назву, то нярэдка існуюць мянушкі ў жыхароў гэтых частак. Напрыклад, в.Забор'е Расонскага р-на дзеліцца на дзве часткі. Жыхароў адной часткі называюць *пашкоўцы*, бо яны ўсе носяць адно прозвішча – *Пашкоў*, а другой – *азяране*, таму што жывуць каля возера. Вёску Азярцы Глыбоцкага р-на насяляюць *шанхайцы, партугальцы і хутаранцы.* Першыя з іх пражываюць у той частцы вёскі, якая тут завецца Шанхай, другія – у Партугаліі, а трэція – у новабудоўлях.

Апісваючы характар існавання мянушак, трэба сказаць, што адны з іх жывуць некалькі гадоў, другія – дзесяцігоддзі і знікаюць са смерцю іх носьбіта, трэція ж перадаюцца з аднаго пакалення ў другое. Напрыклад, *Сібіракамі* называюць ужо чатыры пакаленні роду Казінцоў (па пашпарту). З'явілася мя-

нушка пасля таго, як адзін з Казінцоў пражыў некаторы час у Сібіры ў свайго дзядзькі, а калі вярнуўся дадому, то аднавяскоўцы празвалі яго *Сібіраком*. У далейшым мянушка перайшла на ўвесь род. *Вялічкавы* – так называюць прадстаўнікоў роду Паджарых (па пашпарту). Першым гэтую мянушку атрымаў дзед, які адмаўляўся працаваць у калгасе на Вялікдзень (па-мясцоваму – *Вялічка*). Абедзве прыведзеныя мянушкі бытуюць у Антапольеўскім сельсавеце Чашніцкага р-на.

Як бачым, сучасныя мянушкі жыхароў Віцебшчыны даволі разнастайныя па характары і багатыя па ўнутранай форме. Яны адлюстроўваюць існуючыя сёння рэаліі, паказваюць асаблівасці светаўспрымання беларусаў. Часам мянушкі маюць настолькі глыбокі падтэкст, што без падрабязных звестак пра іх носьбіта не могуць быць растлумачаны і зразумелы.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Тлумачальны слоўнік беларускай мовы***: У 5 т. Т. 5, кн. 2. Мн., 1984.
2. ***Слоўнік гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча***: У 5 т. Т. 2. Д-Л. Мн., 1980. С. 635.



## *SUMMARY*

*Modern nicknames of the Vitebsk region inhabitants are considered in this article. The article highlights the causes of their origin, the character of their basic feature, the pecularities of their functioning on the territory under research. The author analyses personal nicknames, typical of the whole family or the kin. The interrelation between nicknames and the world outlook of the Belarusians is paid attention to.*



*Поступила в редакцию 21.11.2001*